УДК 94(476):35.078“1864/1914”

# Дзейнасць губернатараў па сацыяльна-эканамічным развіцці беларускіх губерняў у 1864–1914 гг.

***Ляпешкін Я.М.***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

*У артыкуле разгледжана дзейнасць губернатараў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў (ацэнкі, прапановы, перапіска) у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця (добраўпарадкаванне, ахова здароўя, пажарна-санітарны стан, будаўніцтва чыгунак і інш.) у 1864–1914 гг. Адлюстроўваюцца матывы і наступствы дзейнасці: станоўчыя і адмоўныя бакі.*

*Мэта артыкула – раскрыць уплыў губернатараў на сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх губерняў у 1864–1914 гг.*

***Матэрыял і метады.*** *Выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Гродна, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Паказана, што адным з прыярытэтных накірункаў у дзейнасці губернатараў было забеспячэнне надзейнага пажарна-санітарнага стану і падтрыманне сістэмы аховы здароўя ў губерні. Адзначаецца, што начальнікі беларускіх губерняў кіраваліся ў сваёй дзейнасці палітычнымі разлікамі ўрада, а гаспадарчы інтарэс мясцовага насельніцтва адыходзіў на другі план.*

***Заключэнне.*** *Кіраўнікі беларускіх губерняў садзейнічалі (праз службовую зацікаўленасць) сацыяльна-эканамічнаму развіццю падначаленых тэрыторый (банкаўская сфера, шляхі зносін, водаправод, тэлефон, нумарацыя дамоў і назвы вуліц, падаткаабкладанне, пазыкі і субсідыі). Праўда, губернатарскія ініцыятывы (адкрыццё банкаўскай установы, будаўніцтва чыгуначнай веткі і інш.) нярэдка замаруджваліся ці ўвогуле не падтрымліваліся з боку вышэйшага начальства па фінансавых, палітычных або ваенна-стратэгічных прычынах.*

***Ключавыя словы:*** *беларускія губерні, губернатары, сацыяльна-эканамічнае развіццё.*

*(Ученые записки. – 2019. – Том 29. – С. 33–40)*

# The Activities of Governors on the Social and Economic Development of Belarusian Provinces in 1864–1914

***Liapeshkin Y.M.***
*Educational Establishment "Belarusian State University", Minsk*

*The article describes the activities of the governors of the Vilnia, Grodno, Minsk, Vitebsk and Mogilev Provinces (assessments, proposals, correspondence) in the field of social and economic development (landscaping, health, fire and sanitary condition, construction of railways, etc.) in 1864–1914. The motifs and consequences of the activity, positive and negative sides, are considered.*

*The purpose of the article is to reveal the influence governors had on the social and economic development of the Belarusian provinces in 1864–1914 through their activities.*

***Material and methods.*** *Materials from the National Historical Archive of Belarus, the National Historical Archive in Grodno, the Russian State Historical Archive are used. The research methods are general scientific and special historical: historical-typological and historical-systemic.*

***Finding and their discussion.*** *It is shown that one of the priorities in the activities of the governors was to ensure reliable fire and sanitary conditions and maintain the health system in the province. It is noted that the heads of the Belarusian provinces were guided in their activities by the political calculations of the government, while the economic interest of the local population faded into the background.*

***Conclusion.*** *The heads of the Belarusian provinces contributed (through service interest) to the social and economic development of subordinate territories (banking, communications, water supply, telephone, numbering of houses and street names, taxation, loans and subsidies). However, gubernatorial initiatives (the opening of a banking institution, the construction of a railway line, etc.) were often slowed down or refused altogether by their superiors for financial, political, or military-strategic reasons.*

***Key words:*** *Belarusian provinces, governors, social and economic development.*

*(Scientific notes. – 2019. – Vol. 29. – P. 33–40)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: Lia.Yauhen@gmail.com* – ***Я.М. Ляпешкін***

Вышэйшымі прадстаўнікамі дзяржаўнай улады на губернскім узроўні ў другой палове XIX – пачатку XX ст. з'яўляліся губернатары. Яны не толькі рэалізоўвалі распараджэнні вышэйшага кіраўніцтва, але і аказвалі сваімі прапановамі ўплыў на ўрадавую палітыку, самастойна прымалі рашэнні, якія спрыялі сацыяльна-эканамічнаму развіццю губерні.

У гістарыяграфіі ў XXI стагоддзі стала ўзрастаць цікавасць да беларускіх губернатараў эпохі Расійскай імперыі. Пры гэтым вывучалася толькі дзейнасць асобных губернатараў [1; 2] альбо разглядаліся іх мерапрыемствы ў межах адной з беларускіх губерняў [3]. Дзейнасць кіраўнікоў усіх беларускіх губерняў цалкам не аналізавалася.

Мэта артыкула – раскрыць уплыў губернатараў на сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх губерняў у 1864–1914 гг.

**Матэрыял і метады.** Выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва ў Гродна, Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Згодна з "Агульным губернскім устанаўленнем" Зводу законаў Расійскай імперыі 1857 г. губернатары прызначаліся і звальняліся манархам, але былі падведамаснымі Міністэрству ўнутраных спраў (МУС) [4, с. 61]. Адначасова яны падпарадкоўваліся генерал-губернатарству на той тэрыторыі, дзе існаваў гэты орган улады [4, с. 157].

"Агульны наказ грамадзянскім губернатарам" ад 3 чэрвеня 1837 г. кваліфікаваў губернатараў як начальнікаў губерняў, якія павінны былі сачыць за выкананнем законаў, абавязваліся захоўваць грамадскі спакой, бяспеку, здаровы стан насельніцтва; забяспечваць харчаваннем губерню, аказваць бездапаможным апеку; ажыццяўляць нагляд за правасуддзем, выкананнем законных пастаноў і патрабаванняў; садзейнічаць умацаванню народнага дабрабыту; сачыць за зборам падаткаў і выкананнем павіннасцей [5, с. 362, 393].

У лік абавязкаў губернатараў па сацыяльна-эканамічнай сферы ўваходзіў нагляд за належным уладкаваннем гарадоў і сёл. Яны павінны былі спрыяць развіццю прамысловасці, сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю; садзейнічаць стварэнню маставых на гарадскіх плошчах і вуліцах; надаваць увагу мерам аховы гарадоў і сёл ад пажараў (добрае ўладкаванне пажарнай часткі і прынясце мер засцярогі ад пажару); паляпшаць шляхі зносін унутры губерні; назіраць за спраўным утрыманнем бальнічных устаноў; рабіць неабходныя распараджэнні для папярэджвання і спынення эпідэмій; старацца распаўсюджваць прышчэпліванне супраць воспы і інш. [5, с. 379–380, 382–383, 386–387, 391–392, 399–401].

Сваю дзейнасць губернатары ажыццяўлялі праз канцылярыю губернатара [4, с. 163–165], губернскае праўленне (у якім яны старшынствавалі), а таксама – праз прыказы і камісіі [5, с. 362]. Начальнікі губерняў абавязкова з'яўляліся старшынямі ў наступных установах: прыказе грамадскай апекі, камісіі народнага харчавання, будаўнічай і дарожнай камісіі, воспенным камітэце, губернскім камітэце грамадскага здароўя, аддзяленні камерцыйнага савета і мануфактурным камітэце, камітэце аб конназаводстве, рэкруцкім камітэце, камітэце земскіх павіннасцей і адмысловай аб гэтых павіннасцях прысутнасці, статыстычным камітэце, турэмным камітэце [4, с. 61–62].

Рэформы, якія распачаліся ў 60-я гг. XIX ст. у Расійскай дзяржаве, вельмі асцярожна, са шматлікімі абмежаваннямі і адтэрміноўкамі праводзіліся і на беларускіх землях.

Перад тым як распаўсюдзіць дзейнасць Гарадавога палажэння ад 16 чэрвеня 1870 г. на заходнія губерні, МУС абмяркоўвала пытанне спосабу яго ўвядзення з мясцовымі генерал-губернатарамі і начальнікамі Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў. Віленскі генерал-губернатар А.Л. Патапаў (1868–1874) і кіеўскі генерал-губернатар А.М. Дандукоў-Корсакаў (1869–1878), як і згаданыя губернскія начальнікі, выказваліся за паступовае ўвядзенне Палажэння 1870 г. з абмежаваннем прадстаўніцтва яўрэяў і палякаў у органах самакіравання [6, с. 25–26]. З 1875 г. яно ўступіла ў законную сілу ў беларускіх гарадах [6, с. 27].

Але, нягледзячы на абмежаванні, губернатары так і засталіся незадаволенымі значнай колькасцю яўрэйскага і польскага прадстаўніцтва ў гарадскім самакіраванні і немагчымасцю ўмяшання ў яго дзейнасць з боку губернскай адміністрацыі [7, с. 35–36]. Так, віцебскі губернатар В.М. Далгарукаў (1884–1894) у 1889 г. прадставіў міністру ўнутраных спраў праект змен Гарадавога палажэння 1870 г. для заходніх губерняў [7, с. 37]. Асноўныя прынцыпы гэтага праекта знайшлі адлюстраванне ў новым Гарадавым палажэнні 1892 г. У ім узмацняліся выбарчы цэнз і кантроль за дзейнасцю гарадскога самакіравання з боку губернатара. Прычым у Беларусі значна змяншалася колькасць яўрэйскіх выбаршчыкаў [7, с. 39].

Разам з уплывам на ход рэформаў губернатары займаліся і больш надзённымі пытаннямі

сацыяльна-эканамічнага жыцця падведамасных тэрыторый.

У галіне добраўпарадкавання населеных пунктаў губерні і інфраструктуры, якая іх аб’ядноўвала, начальнікі губерняў прыкладалі пастаянныя намаганні.

У выніку рэвізіі Віцебскай губерні губернатар П.П. Касагоўскі (1867–1868) прыйшоў да высновы, што невысокая добраўпарадкаванасць гарадоў была звязана з нездавальняючым станам гарадскіх даходаў. Ён лічыў, што павелічэнне даходаў і затым паляпшэнне становішча гарадоў залежыць ад саміх гарадскіх уласнікаў. Таму 27 мая 1868 г. начальнік губерні прапанаваў “прадпісаць усім гарадскім думам Віцебскай губерні неадкладна ўтварыць з асяроддзя гарадскіх колаў інвентарныя камісіі па правілах, выкладзеных у дадзенай ім інструкцыі, асобнікі якой паслаць у думы з тым, каб яны неадкладна … распачалі работы…” [8, арк. 145].

Інвентарным камісіям, згодна з інструкцыяй, ставілася мэта скласці вопісы рухомай і нерухомай гарадской маёмасці і ўказаць сродкі павелічэння гарадскіх даходаў [8, арк. 146].

Заслугоўваюць увагі і іншыя губернатарскія ініцыятывы. Так, праект водаправода П.Я. Растоўцава (1869–1880) быў ухвалены віцебскай гарадской супольнасцю. Таму губернатар хадайнічаў перад міністрам унутраных спраў аб атрыманні дзяржаўнай грашовай дапамогі на рэалізацыю гэтай задумы [1, с. 180].

На добраўпарадкаванне гарадоў звярталі ўвагу і начальнікі Мінскай губерні. Так, губернатар

Я.А. Касінаў (1868–1869) пры аглядзе губерні заўважыў нездавальняючы стан гарадскіх гаспадарак. У выніку ён пераняў задуму свайго віцебскага калегі. 25 верасня 1868 г. праз губернскае праўленне гарадскім думам было прапанавана заснаваць у кожным горадзе інвентарную камісію, якая і павінна была распрацаваць шляхі да павелічэння гарадскіх даходаў і да паляпшэння гарадскога добраўпарадкавання паводле дадзенай інструкцыі [8, с. 155–155 зв.].

Губернатар А.І. Пятроў (1879–1886) выступіў з ініцыятывай усталявання паказальнікаў на вуліцах Мінска. І ў пачатку 1880 г. Мінская гарадская дума прыняла рашэнне аб усталяванні вулічных паказальнікаў. Таксама гарадская дума падтрымала прапанову А.І. Пятрова аб добраўпарадкаванні абочыны Лібава-Роменскай чыгункі [3, с. 245].

Пры ўдасканаленні бытавых умоў у Мінску гарадскія ўлады атрымалі дапамогу з боку губернатара А.І. Пятрова ў фінансавым пытанні. Гарадскі галава ў 1885 г. вёў перамовы з начальнікам Мінскай губерні пра “перадачу гораду пазыкі на прывядзенне ў парадак гарадскіх водаправодаў 6 тысяч руб. з сум, сабраных на дапамогу пагарэльцам…”. Губернатар згаджаўся адпусціць гораду патрэбную суму ў якасці пазыкі, але з выплатаю на працягу шасці гадоў з працэнтамі. Пры гэтым у выпадку якога-небудзь бедства патрабавалася вярнуць увесь заняты капітал. Гарадская дума прыняла гэтыя ўмовы [9, арк. 11–11 зв.].

Паляпшэннем пазнавальнасці вулічнай сеткі займаўся мінскі губернатар А.Ф. Гірс (1912–1915). 22 сакавіка 1913 г. ён выдаў абавязковую пастанову для мястэчак і дачных пасёлкаў Мінскай губерні аб нумарацыі дамоў і сядзіб. Уладальнікі абавязваліся пазначаць нумары сваіх дамоў і сядзіб, а на рагавых дамах – вывешваць табліцы з пазначэннем назвы вуліц [10, арк. 4]. 24 сакавіка 1913 г. А.Ф. Гірс паведаміў міністру ўнутраных спраў аб выданні згаданай пастановы і абгрунтаваў свае дзеянні. Мінскі губернатар тлумачыў, што нумарацыя дамоў і ўчасткаў значна палегчыла б выкананне работ пры абкладанні маёмасцей падаткам [10, арк. 13–13 зв.].

Губернатары клапаціліся і пра развіццё новых сродкаў сувязі. Так, магілёўскі губернатар М.А. Зіноўеў (1893–1901) вёў перапіску з Галоўным упраўленнем пошт і тэлеграфаў аб наладжванні ў Магілёве тэлефоннай сувязі. Але хадайніцтва пра ўладкаванне гарадской тэлефоннай сеткі магло быць распачата толькі па ўнясенні паловы ўсталяванай за карыстанне ёй гадавой платы. Таму, згодна з выстаўленай таксай, 27 жніўня 1898 г. губернатар прасіў усіх, хто выказаў згоду на карыстанне тэлефонам, унесці абаненцкую плату за паўгода наперад у памеры 37 руб. 50 кап. [11, арк. 7].

І гэты заклік знайшоў водгук. Зацікаўленыя прыватныя асобы і ўстановы ўносілі плату і прысылалі квітанцыі губернатару [11, арк. 14–19]. Некаторыя ж чыноўнікі, такія як старшыня Магілёўскага акруговага суда, адмаўляліся ад усталявання тэлефоннай сувязі з-за адсутнасці наяўных грошай [11, арк. 11].

Але пры М.А. Зіноўеве магіляўчане не дачакаліся правядзення ў горадзе тэлефоннай сеткі. Галоўнае ўпраўленне пошт і тэлеграфаў праз начальніка Мінскай паштова-тэлеграфнай акругі 31 ліпеня 1901 г. праінфармавала ўжо наступнага магілёўскага губернатара М.К. Сямякіна (1901–1902), што “ў цяперашні час не мяркуецца ўладкавання ў г. Магілёве ўрадавай тэлефоннай сеткі для агульнага карыстання” [11, арк. 52].

Аднак вырашаць гэтае пытанне працягваў яго пераемнік М.М. Клінгенберг (1902–1905). У 1903 г.

ён ізноў хадайнічаў у Галоўнае ўпраўленне пошт і тэлеграфаў наконт наладжвання ў Магілёве тэлефоннай сеткі. Нарэшце, 21 верасня 1903 г. яно паведаміла губернатару, што "зроблены ўсе распараджэнні і сетку мяркуецца адкрыць восенню бягучага года" [12, арк. 52–52 зв., 57].

Падтрыманне належнага санітарнага стану населеных пунктаў і барацьба з эпідэміямі станавіліся неад'емным клопатам для начальнікаў губерняў. Напрыклад, віленскі губернатар С.Ф. Панюцін (1863–1868) у 1866 г. актыўна спрыяў спыненню эпідэміі халеры ў Вільні. Гарадская супольнасць нават хацела ўручыць С.Ф. Панюціну ганаровае грамадзянства, але ён адмовіўся [13, с. 294].

Для папярэджвання эпідэмій халеры і воспы віцебскі губернатар П.Я. Растоўцаў хадайнічаў у міністра ўнутраных спраў аб фінансаванні аплаты дадатковых фельчараў і дактароў, а таксама аб набыцці медыкаментаў. Губернатар арганізаваў бясплатную вакцынацыю ад воспы для бедных жыхароў і пасадзейнічаў заснаванню ў 1874 г. Віцебскага медыцынскага таварыства [1, с. 182–183].

Наступствы эпідэмій у тагачасных гарадскіх умовах маглі быць жудаснымі. Таму начальнікі губерняў актыўна сачылі за адпаведнай інфармацыяй і рабілі неабходныя захады ў выпадках пагрозы заразнай хваробы.

Камісія аб мерах папярэджвання і барацьбы з чумнаю пошасцю аб'явіла 4 мая 1910 г. Віцебскую губерню ў стане пагрозы халеры. У сувязі з гэтым губернатар Б.Б. Гершаў-Флотаў (1904–1911) прыняў неадкладныя меры. 5 мая ён выдаў абавязковую пастанову, якая ўтрымлівала падрабязныя санітарныя патрабаванні для мясцовых жыхароў. За іх парушэнне прадугледжвалася грашовае пакаранне да 300 рублёў або арышт да 3 месяцаў [14, арк. 192–193]. 6 мая 1910 г. павятовым спраўнікам і паліцмайстрам Віцебскай губерні спешна было разаслана распараджэнне аб расклейцы пастановы ва ўсіх больш-менш значных населеных пунктах губерні [14, арк. 116–117]. Падобныя адміністрацыйныя захады спрыялі пераадоленню наступстваў эпідэміі.

З прычыны моцнага распаўсюджвання ў паветах Мінскай губерні натуральнай воспы ў цыркуляры ад 1 сакавіка 1881 г. губернатар А.І. Пятроў экстранна прадпісаў павятовым спраўнікам праверыць наяўнасць у фельчараў у дастатковай колькасці воспеннага матэрыялу. У адваротным выпадку ён загадваў распарадзіцца аб яго набыцці. Губернатар таксама прапаноўваў, па магчымасці, сачыць за спраўным прышчэпліваннем воспы. А.І. Пятроў абавязваў павятовых спраўнікаў у выпадку ўзмацнення натуральнай воспы даносіць яму і ўсялякімі мерамі растлумачваць сялянам усю неабходнасць і карысць прышчэплівання [15, арк. 3–3 зв.].

У сваёй дзейнасці губернатары надавалі значную ўвагу і супрацьпажарным мерапрыемствам. Пажары былі частай з'явай у другой палове XIX – пачатку XX ст. Таму губернатары падчас інспектарскіх паездак удзялялі даволі часу на ацэнку і прывядзенне ў парадак стану супрацьпажарнай бяспекі.

Так, праверка ў 1872 г. магілёўскім губернатарам А.С. Дамбавецкім (1872–1893) дзейнасці магілёўскай пажарнай каманды паказала яе поўную неэфектыўнасць. У выніку начальнік губерні распарадзіўся пакараць вінаватых і выправіць недахопы [2, с. 44].

Падобныя інспекцыі праводзіў выконваючы пасаду (в.п.) магілёўскага губернатара А.І. Пільц (1910–1916). У цыркуляры ад 22 чэрвеня 1910 г. ён прасіў звярнуць увагу земскіх начальнікаў і павятовых спраўнікаў Магілёўскай губерні на "ўтрыманне ў поўным парадку сельскіх і валасных пажарных абозаў". З'яўленне гэтага дакумента стала вынікам праверкі аднаго з валасных праўленняў, дзе ў нядбайным стане знаходзіўся пажарны абоз: "…рукаў ад машыны разарваны, самая машына ляжала ў нейкім хляве, калёсы з-пад яе знаходзіліся ў іншым месцы і, відавочна, служылі і для іншых мэт і, нарэшце, ні бочак, ні вёдраў пры абозе не існуе". Начальнік губерні з сумам канстатаваў гэты факт, паколькі штодня паступалі весткі пра пажары, "ахвярамі якіх робяцца цэлыя паселішчы" [16, с. 155].

Звярталі на гэтыя абставіны ўвагу і віцебскія губернатары. Калі да П.Я. Растоўцава ў 1870 г. паступіла прапанова аб паляпшэнні пажарнай часткі, то ён распарадзіўся паведаміць пра гэта адмысловай камісіі і асобна прапанаваў камісіі арганізаваць памяшканне для пажарнай каманды [1, с. 180–181].

У Віцебскай губерні былі заснаваны вольныя пажарныя таварыствы. П.Я. Растоўцаў хадайнічаў аб зацвярджэнні іх статутаў і бяспошліннага правозу з-за мяжы пажарнага рыштунку для гэтых таварыстваў [1, с. 181].

Клапаціліся аб пажарнай бяспецы і ў Гродзенскай губерні. Пры аглядзе гродзенскім губернатарам М.М. Цэймернам (1879–1883) брэсцкага пажарнага абозу ён заўважыў шматлікія няспраўнасці. У сувязі з тым, што набыццё і рамонт пажарнага абозу фінансавалася з гарадскога бюджэту, начальнік губерні 30 мая 1879 г. прасіў брэсцкага гарадскога галаву "прыняць са свайго боку самыя энергічныя меры, каб пажарны абоз у даволі хуткі час быў прыведзены ў спраўнасць…" [17, арк. 4–5].

Працавалі эфектыўна і віленскія губернатары. У справаздачы за 1894 г. віленскі губернатар М.А. Грэвеніц (1885–1895) адзначаў наяўнасць для тушэння пажараў у сельскай мясцовасці толькі "першабытных прылад". Набыццё спецыяльных супрацьпажарных матэрыялаў за кошт сялян, якія не мелі для гэтага сродкаў, было немагчыма. Таму начальнік губерні, згодна з заключэннем губернскай па сялянскіх справах прысутнасцю, звярнуўся да генерал-губернатара П.В. Аржэўскага з просьбай аб дазволе "расходаваць штогод па 20000 р. са страхавога капіталу на паступовае набыццё для валасцей вогнегасільных снарадаў без патрабавання ад сялян вяртання гэтых грошай". Імператар, які азнаёміўся са справаздачай, пакінуў адзнаку насупраць гэтай прапановы – "пажаданая мера" [18, арк. 6–7].

Такім чынам, важным накірункам у дзейнасці начальнікаў губерняў было забеспячэнне надзейнага пажарна-санітарнага стану ў губерні для папярэджвання непажаданых наступстваў.

Неад'емнай галіной у сацыяльна-эканамічнай сферы, дзе праяўлялася губернатарская актыўнасць, была сістэма аховы здароўя. Лячэбныя ўстановы абавязкова правяраліся губернатарам. У выпадках выяўлення хібаў ён прадпісваў іх выпраўляць.

Так, у поле зроку віцебскага губернатара У.М. Вяроўкіна (1863–1867) трапіла бязладдзе Віцебскай яўрэйскай бальніцы. Таму 12 кастрычніка 1865 г. ён прапанаваў Віцебскаму губернскаму праўленню зрабіць наступныя распараджэнні: папоўніць адсутную колькасць бальнічных рэчаў; абавязаць апекуноў бальніцы выконваць прынятыя абавязкі "не на словах, а на справе"; невылечных і састарэлых хворых аддаць на апеку сваякоў або дабрачынцаў; зладзіць вонкавы парадак у бальнічным доме; запатрабаваць справаздачу прыходу і выдатку грашовых сум бальніцы [19, арк. 1–1 зв.].

У 1880 г. губернатар В.В. фон Валь (1880–1884), які абрэвізаваў Віцебскую губерню, станоўча выказваўся аб заснаванні сельскай бальніцы ў г. Гарадку. Яна існавала на сродкі сялян, мела "зручнае памяшканне" і ўтрымлівалася "даволі прыстойна". Начальнік Віцебскай губерні загадаў паведаміць пра гэта ва ўсе павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, "звярнуўшы іх асаблівую ўвагу аб пажаданасці ўстановы такіх і па іншых гарадах" [20, арк. 151 зв., 175].

Звярталі ўвагу на стан аховы здароўя і ў Гродзенскай губерні. Пры аглядзе Гродзенскай бальніцы мясцовы губернатар М.М. Цэймерн выявіў недахопы ў матэрыяльным забеспячэнні (казённая бялізна і пасцельныя рэчы без належных клеймаў) і ў харчаванні ("капуста апынулася цалкам нікуды непрыдатнай"). Ён звярнуў увагу і на ўмовы ўтрымання хворых: "…я прызнаю нязручным, трыманне пры бальнічнай установе хатняга быдла, якім абзавёўся наглядчык бальніцы". З прычыны гэтага 11 чэрвеня 1879 г. губернатар прапаноўваў Гродзенскаму прыказу грамадскай апекі ліквідаваць заўважаныя нязручнасці [17, арк. 12–13].

У справе аховы здароўя губернатары не толькі праводзілі праверкі, але і рабілі больш даступным медыцынскае абслугоўванне. Па прапанове мінскага губернатара В.І. Чарыкава былі арганізаваны перасоўныя лазарэты, якія маглі аказваць медыцынскую дапамогу і ў сельскай мясцовасці [3, с. 239].

Такім чынам, сістэма аховы здароўя была адным з прыярытэтных накірункаў у дзейнасці начальнікаў губерняў.

Безумоўна, ажыццяўленне рэформаў у сельскай гаспадарцы не абыходзілася без удзелу губернатараў. Напярэдадні Сталыпінскай аграрнай рэформы ўказам ад 4 сакавіка 1906 г. ствараліся губернскія і павятовыя землеўпарадкавальныя камісіі. Губернскія камісіі павінны былі стварацца пад старшынствам губернатара. Як адзначае даследчыца А.А. Падарожняя, "да канца існавання імперыі, губернскія ўлады ў Беларусі захавалі за сабой поўны кантроль над сялянскім самакіраваннем і яго рэфармаваннем", паколькі спецыялісты, якія праводзілі агратэхнічныя мерапрыемствы, знаходзіліся пад наглядам губернатара. Напрыклад, у Віцебскай губерні значныя сродкі на агранамічныя патрэбы вылучаліся земствам і губернскай землеўпарадкавальнай камісіяй [21, арк. 66].

У копіі журнала прыватнай нарады земскіх начальнікаў Рэчыцкага павета, якая адбылася 19 мая 1913 г., зафіксавана асабістая прапанова мінскага губернатара А.Ф. Гірса. Праз павятовага прадвадзіцеля дваранства ён звяртаў увагу на пажаданасць "пераходу сельскіх грамад ад натуральнага праз перадачу хлеба ў крамы да грашовага спосабу харчовага забеспячэння сельскага насельніцтва". На нарадзе падтрымалі гэту прапанову і вырашылі для яе ажыццяўлення прыняць усе неабходныя меры [22, арк. 115]. Такім чынам, губернатар садзейнічаў больш прагрэсіўным рынкавым адносінам гаспадарання.

Начальнікі губерняў звярталі ўвагу і на становішча ў прамысловасці. У штогадовых справаздачах губернатары нярэдка прыводзілі не толькі ацэнкі бягучага стану сацыяльна-эканамічнага развіцця губерні, але і свае прапановы.

Так, магілёўскі губернатар А.П. Беклемішаў (1857–1868) у справаздачы імператару за 1865

г. падкрэсліваў недастатковае развіццё мясцовых фабрык і заводаў. Пры гэтым ён выказваў спадзяванне, што "заводская прамысловасць у выніку адмены прыгоннага права значна тут будзе развівацца", бо губерня багата на лес і суднаходныя рэкі [23, арк. 19 зв.–20].

Начальнікі губерняў аналізавалі прычыны таго ці іншага стану прамысловага развіцця. "Па недахопу прадпрымальнасці і капіталаў і адсутнасці тэхнічнай адукацыі фабрычная і заводская прамысловасць у Віленскай губерні развіта слаба", – пісаў віленскі губернатар А.М. Жамчужнікаў (1882–1885) у справаздачы за 1883 г. [24, арк. 4–4 зв.].

У справаздачы за 1872 г. віцебскі губернатар П.Я. Растоўцаў ахарактарызаваў застойны стан у развіцці мясцовай прамысловасці і гандлю. Таму ён прызнаваў вельмі карысным для паляпшэння эканамічнага стану адкрыць у Віцебску аддзяленне Дзяржаўнага банка. У гэтым яго падтрымала і віцебская гарадская супольнасць. У сувязі з гэтым губернатар уваходзіў з прадстаўленнем да міністра фінансаў [1, с. 177–178]. Але з-за чаргі падобных хадайніцтваў просьба не магла быць задаволена ў бліжэйшы час [25, арк. 126].

Намаганні кіраўнікоў губернскай адміністрацыі накіроўваліся на ўдасканаленне шляхоў зносін. Напрыклад, губернатар А.П. Беклемішаў адзначаў вельмі слабае разгортванне суднаходства ў Магілёўскай губерні і лічыў, што прычына таго "заключаецца ў Дняпроўскіх мелях і засмечанасці рэчышча". Са свайго боку ён тлумачыў манарху: "…адносна паглыблення фарватара на найгалоўных мелях … вядзецца цяпер перапіска з ведамствам шляхоў зносін" [23, арк. 21 зв.]. Яшчэ чыноўнік прапаноўваў злучыць адмысловай веткай Віцебска-Смаленскую чыгунку з Магілёвам – "крайнім пунктам суднаходнага Дняпра" і "перадавым портам дзейнасці па русіфікацыі супраць апалячанага захаду" [23, арк. 43 зв.]. Адсюль вынікае, што ў сваіх прапановах па гаспадарчым развіцці губерні А.П. Беклемішаў кіраваўся не толькі эканамічнымі чыннікамі, але і палітычнымі.

Мадэрнізацыя Расійскай імперыі патрабавала развіцця транспартнай сістэмы, у тым ліку і на беларускіх землях.

Ініцыятывы будаўніцтва чыгунак часта ўзнікалі з боку прыватных асоб. Так, у пачатку 1860-х гг. група буйных палескіх землеўладальнікаў хадайнічала аб правядзенні чыгуначнай лініі, якая злучыла б Беласток з Пінскам. У 1862 г. Аляксандр II дазволіў ажыццявіць падобны праект, але без урадавага фінансавання. Таму стваралася адмысловае акцыянернае таварыства Літоўскай чыгункі і планавалася пабудаваць лінію на працягу 1863–1865 гг. Але ў сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. гэты праект адмоўна ацаніў Заходні камітэт. На яго думку, чыгунка служыла б умацаванню сувязі беларускіх губерняў з польскімі, а не з Цэнтральнай Расіяй. Таму імператар зацвердзіў забарону [26, с. 123, 125–126]. Гэты прыклад паказвае тое, што будаўніцтва чыгунак нават за неказённы кошт не магло ажыццяўляцца, калі гэта супярэчыла ваенна-стратэгічным ці палітычным планам імперскага ўрада.

У гэтыя працэсы ўцягваліся і галоўныя адміністратары губерні.

Так, у 1882 г. слуцкі павятовы прадвадзіцель дваранства хадайнічаў ад імя мясцовых памешчыкаў перад мінскім губернатарам А.І. Пятровым аб правядзенні чыгункі паміж г. Слуцкам і станцыяй Гарадзеяй. Ён тлумачыў, што Слуцкі павет з'яўляецца ўрадлівай мясцовасцю губерні і выпрабляе значныя запасы хлеба. Да таго ж у павеце значная колькасць ляснога матэрыялу. Але "пры адсутнасці ж водных ды чыгуначных зносін з гандлёвымі пунктамі надзвычай шмат губляе ў матэрыяльных адносінах і сапраўды вельмі мае патрэбу ў правядзенні чыгункі" [27, арк. 1–1 зв.].

15 мая 1882 г. в.п. губернатара віцэ-губернатар І.П. Альбядзінскі (1876–1886) звярнуўся з гэтым хадайніцтвам у Праўленне Маскоўска-Брэсцкай чыгункі і прасіў паведаміць: "…ці можна чакаць, што пытанне аб злучэнні г. Слуцка з лініяй Маскоўска-Брэсцкай дарогі будзе вырашана ўрадам у сцвярджальным сэнсе" [27, арк. 3].

Таварыства Маскоўска-Брэсцкай чыгункі 20/21 ліпеня 1882 г. са свайго боку зрабіла заключэнне аб неабходнасці правядзення чыгункі. Таварыства спадзявалася "на гатоўнасць мясцовых землеўладальнікаў, зацікаўленых у правядзенні веткі, аказаць сваё матэрыяльнае садзейнічанне" для ажыццяўлення гэтага праекта і прасіла губернатара хадайнічаць перад урадам "аб здавальняючым вырашэнні пытання…" [27, арк. 4–4 зв.].

Мінскі губернатар А.І. Пятроў прадпісаў паліцэйскім Слуцкага і Навагрудскага паветаў Мінскай губерні "аказваць поўнае садзейнічанне" інжынеру і камерцыйнаму агенту. Іх камандзіравала Праўленне Маскоўска-Брэсцкай чыгункі для збору звестак, неабходных пры абмеркаванні ўмоў уладкавання пад'язной чыгуначнай веткі ад Слуцка да станцыі Гарадзея Маскоўска-Брэсцкай чыгункі [27, арк. 12]. Але праз Слуцк чыгунка так і не прайшла [28, с. 22]. Таму хадайніцтвы губернатара і слуцкіх землеўладальнікаў не мелі поспеху.

Зусім па-іншаму разгортваліся падзеі пры ініцыяванні будаўніцтва чыгункі "зверху". З кра-

савіка 1882 г. імператар ухваліў прапанову ваеннага міністра “аб пабудове распараджэннем ваеннага ведамства ўчастка чыгункі ад станцыі Жабінка, Маскоўска-Брэсцкай чыгункі, да г. Пінска, даўжынёй 138 вёрст”. Для падрыхтоўчай работы над гэтай лініяй Ваенным міністэрствам былі камандзіраваны ў Мінскую губерню інжынеры і тэхнікі, якія забяспечваліся адкрытымі лістамі ад Галоўнага штаба. 7 мая 1882 г. Дэпартамент агульных спраў МУС па распараджэнні міністра прасіў мінскага губернатара загадаць мясцовым уладам аказваць гэтым спецыялістам “садзейнічанне пры выкананні ўскладзенага на іх даручэння” [29, арк. 1–1 зв.].

Часовае кіраўніцтва па пабудове Жабінка-Пінскай чыгункі 30 мая 1882 г. паведаміла начальніку Мінскай губерні, што з ліпеня плануе распачаць будаўніцтва, у сувязі з чым прасіла распарадзіцца “павятовым, валасным і сельскім уладам … губерні аб аказанні агентам ... садзейнічання…” [29, арк. 6–6 зв.].

9 чэрвеня 1882 г. мінскі губернатар прадпісаў пінскаму павятоваму спраўніку аказаць падтрымку галоўнаму агенту па адчужэнні маёмасцей і іншым асобам, якія знаходзяцца ў яго распараджэнні, і паведаміць пра гэта ўладальнікам участкаў, землі якіх адышлі пад будаўніцтва чыгункі [29, арк. 7].

Работы па Жабінка-Пінскай чыгунцы вяліся хутка, і ўжо 9 лістапада 1882 г. яе адкрылі для перавозкі пасажыраў і тавараў [26, с. 129].

Такім чынам, праекты будаўніцтва чыгунак, прапанаваныя з цэнтра і важныя з пункту гледжання ваеннай стратэгіі, былі больш паспяховымі, чым ініцыятывы грамадскай супольнасці, якія падтрымліваў начальнік губерні. Гэта сведчыць аб тым, што цэнтральная ўлада пакідала для губернатараў не бязмежны ўплыў на ход мясцовага жыцця. Агульнадзяржаўныя інтарэсы мелі перавагу над мясцовымі.

Некаторыя губернатары імкнуліся максімальна палепшыць стан губерні за тэрмін свайго кіравання. Так, начальнік Магілёўскай губерні А.С. Дамбавецкі адразу пасля прызначэння пачаў праводзіць у жыццё змены, накіраваныя на ліквідацыю запазычанасцей перад дзяржавай [2, с. 39].

У 1874 г. па яго прадстаўленні Міністэрства фінансаў згадзілася адтэрмінаваць нядоімкі сялян на 10 гадоў. Прычым на працягу гэтага тэрміну прадугледжвалася “спаганяць аклады выкупных плацяжоў у палавінным памеры, пры гэтым дадаць іншую палову да нядоімкі, пагашэнне якой павінна пачацца па заканчэнні 10 гадоў” [2, с. 39–40].

А.С. Дамбавецкі таксама настаяў на тым, каб сяляне, згодна з указам імператара ад 2 лістапада 1863 г., атрымалі прырэзкі, якія не былі ім перададзены. Акрамя таго, пры А.С. Дамбавецкім была ўстаноўлена часовая апека над сялянскімі гаспадаркамі і нават цэлымі вёскамі, якія мелі значныя нядоімкі [2, с. 40–41].

Фінансаванне сялянскага самакіравання забяспечвалася за кошт сялян. З падачы А.С. Дамбавецкага гэтая катэгорыя расходаў сялянскага насельніцтва зведала рэструктурызацыю. Напрыклад, жалаванне валаснога старшыні і пісара было значна паніжана, што скарачала расходы сялянскай сям’і [2, с. 41–43].

Пры ўладзе А.С. Дамбавецкага ажыццяўляліся меры, накіраваныя на змяншэнне нядоімак яўрэйскага насельніцтва. Для гэтага нядоімкі ўключаліся ў суму каробачнага збору. Такім чынам адбылося перанясенне падатковага цяжару з бедных яўрэяў на больш заможных. Нaваўвядзенні аказаліся эфектыўнымі і змаглі пакрыць запазычанасці бяднейшых кагалаў [2, с. 43].

Тым не менш у пачатку 1880-х гг. МУС адзначала, што “акладныя зборы як з сельскіх жыхароў, так і з прыватных уласнікаў паступалі ў апошнія гады вельмі нездавальняюча”. Міністэрства разлічвала пры парадку, які ўжо ўсталяваўся, на паспяховае паступленне падатных плацяжоў з сялян. Але значнае назапашванне нядоімак лічылася за прыватнымі землеўладальнікамі. Таму губернатар А.С. Дамбавецкі 22 лістапада 1883 г. па просьбе міністра ўнутраных спраў прадпісваў чынам паліцыі, каб “яны пры спагнанні надалей акладных збораў дакладна і няўхільна кіраваліся ўказаннямі, якія існуюць у законе” [30, арк. 60].

Варта згадаць, што былі начальнікі, якія больш думалі пра ўласны дабрабыт, чым пра развіццё даручанай ім губерні. Напрыклад, чыноўнік У.М. Токараў у 1876 г. быў прыцягнуты да суда за злоўжыванні падчас знаходжання на пасадзе мінскага губернатара [3, с. 229–230].

**Заключэнне.** Такім чынам, рэгламентаваная заканадаўствам дзейнасць начальнікаў пяці беларускіх губерняў была шматбаковай. Яе сутнасць заключалася ў рэальнай ацэнцы наяўнай сітуацыі, выяўленні праблем і прыняцці мер, накіраваных на іх вырашэнне рознымі органамі. Апошняе адбывалася праз распараджэнні падначаленым асобам, установам і хадайніцтвы вышэйшаму кіраўніцтву. Адным з прыярытэтных накірункаў у дзейнасці губернатараў было забеспячэнне надзейнага пажарна-санітарнага стану і падтрыманне сістэмы аховы здароўя. Кіраўнікі беларускіх губерняў ака-

звалі пэўны ўплыў на ўрадавую палітыку, часта выступалі з прапановамі і асабіста садзейнічалі (праз службовую зацікаўленасць) сацыяльна-эканамічнаму развіццю падначаленых тэрыторый (банкаўская сфера, шляхі зносін, водаправод, тэлефон, нумарацыя дамоў і назвы вуліц, падаткаабкладанне, пазыкі і субсідыі). Праўда, губернатарскія ініцыятывы (адкрыццё банкаўскай установы, будаўніцтва чыгуначнай веткі і інш.) нярэдка замаруджваліся ці ўвогуле не падтрымліваліся з боку вышэйшага начальства па фінансавых, палітычных або ваенна-стратэгічных прычынах. Пры гэтым у першую чаргу важную ролю адыгрывалі палітычныя разлікі ўрада, а гаспадарчы інтарэс беларускага насельніцтва адыходзіў на другі план.

## Літаратура


1. Вернер, И.Л. На губернаторском посту (о деятельности Павла Яковлевича Ростовцева по управлению Витебской губернией в 1869–1880 гг.) / И.Л. Вернер // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / рэдкал.: Ю.М. Бохан [і інш.]. – Мінск: НГАБ, 2007. – Вып. 5. – С. 175–187.
2. Сидоренко, Б.И. Могилевский губернатор Александр Станиславович Дембовецкий и его время / Б.И. Сидоренко. – Могилев: АмелияПринт, 2012. – 250 с.
3. Бригадин, П.И. Минские губернаторы: история власти / П.И. Бригадин, А.М. Лукашевич. – Минск: ГИУСТ БГУ, 2009. – 351 с.
4. Свод законов Российской империи: изд. 1857 г.: [в 16 т.]. – СПб., 1857. – Т. 2, ч. 1: Общее губернское учреждение. – 1474 с.
5. Общий наказ гражданским губернаторам: именной указ Сенату, 3 июня 1837 г., № 10303 // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2: в 55 т. – СПб., 1838. – Т. 12: Отд. 1. – С. 361–439.
6. Юрочкин, М.А. Реформа городского самоуправления в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / М.А. Юрочкин. – Гомель: Белницэкология, 2002. – 151 с.
7. Подорожняя, Е.А. Проект витебского губернатора В.М. Долгорукова по реформированию городского самоуправления / Е.А. Подорожняя // Актуальные вопросы современной науки: сб. науч. работ / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: В.В. Бущик (отв. ред.), Д.И. Наумов, Г.А. Космач [и др.]. – Минск: БГПУ, 2011. – С. 35–40.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1931. Сведения о результатах ревизии уездных присутственных мест и учреждений, произведенной начальником губернии. 23.06.1868–05.11.1868.
9. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3976. Дело об исправлении городских водопроводов Минской городской управой. 15.06.1885–01.01.1903.
10. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8308. Дело об издании обязательного постановления о нумерации домов, усадеб в местечках и дачных поселках Минской губ. 22.03.1913–06.09.1913.
11. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1146. Переписка с Главным управлением почт и телеграфов об устройстве в гор. Могилеве телефонной станции. 27.06.1901–17.08.1901.
12. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1853. Дело об устройстве в гор. Могилеве телефонной сети и план гор. Могилева. 24.07.1902–09.10.1903.
13. Майков, П.М. Панютин, Степан Феодорович / П.М. Майков // Русский биографический словарь: в 25 т. – СПб.–М., 1896–1918. – Т. 13: Павел, преподобный – Петр (Илейка). – 1902. – С. 293–296.
14. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 2. Спр. 705. Дело об объявлении в положении усиленной охраны гор. Полоцка, Двинска, Речицы и др. 24.03.1905–23.11.1910.
15. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3584. Циркуляр губернатора уездным исправникам о принятии мер по прививке против заболеваний натуральной оспы в губернии. 27.02.1881–01.03.1881.
16. Могилевские губернские ведомости. – 1910. – 26 июня. – № 50.
17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. – Ф. 1. Воп. 8. Спр. 2. Дело о ревизии губернатором присутственных мест по уездам губернии. 22.05.1879–17.12.1879.
18. Навукова-даведачная бібліятэка Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва. – Папка 87673. Всеподданнейший отчет виленского губернатора за 1894 г. – 11 арк.
19. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 52604. Дело по предписанию витебского губернатора Витебскому губернскому правлению о приобретении для Витебской еврейской больницы необходимых больничных вещей и наведении надлежащего там порядка. 12.10.1865–13.10.1865.
20. НГАБ. – Ф. 1416. Воп. 3. Спр. 14619. Дело по предложению витебского губернатора о ревизии, произведенной им по всем уездам Витебской губернии. 26.07.1880–05.11.1880.
21. Подорожняя, Е.А. Местные органы государственной власти и управления в Беларуси (1861–1914 гг.): структура, функции, кадры: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е.А. Подорожняя. – Минск, 2014. – 180 л.
22. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8105. Дело о службе минского губернатора действительного статского советника А.Ф. Гирса. 26.11.1912–08.08.1915.
23. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 975. Сведения к годовому отчету за 1865 г. 17.03.1865.
24. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 1284. Воп. 223. 1884 г. Спр. 89. Дело со всеподданнейшим отчетом о состоянии Виленской губернии за 1883 г. 07.05.1884–25.06.1884.
25. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 35222. Материалы ко всеподданнейшему отчету по Витебской губ. за 1872 г. 28.12.1872–02.04.1873.
26. История белорусской железной дороги. Из XIX века – в век XXI: 1862–2012 / В.В. Яновская [и др.]. – Минск: Мастацкая літаратура, 2012. – 958 с.
27. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3716. Дело о разрешении помещикам Слуцкого уезда построить железнодорожную ветвь от гор. Слуцка до ст. Городеи Московско-Брестской жел. дороги. 29.04.1882–28.08.1882.
28. Обзор Минской губернии за 1901 год. – Минск: Минский губернский статистический комитет, 1902. – [2], 47, [48] с.
29. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3717. Дело о строительстве участка железной дороги от ст. Жабинка до гор. Пинска Московско-Брестской железной дороги. 10.05.1882–14.08.1882.
30. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1187. Циркуляры губернатора (копии) об открытии церковно-приходских школ при церквях. Списки иностранных подданных. 08.01.1883–31.12.1883.


*Пастyпіў у рэдакцыю 03.04.2019 г.*